**Беларуская мова 2 – 4 клас.**
Настаўнік: Магілевіч З.В.
# Падарожжа па Краіне роднай мовы

**Мэта:** -пашыраць і паглыбляць веды аб роднай мове;
-развіваць пазнавальную цікаўнасць малодшых школьнікаў;
-выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, патрыятызм.

## Ход мерапрыемства

**Вяд.**: Добры дзень, дзеці! Сёння я прапаную вам накіравацца ў падарожжа па … . Але не, месца нашага падарожжа я вам не назаву. Вы здагадаецеся самі. А як? На дошцы намалявана крыжаванка. Толькі адгадаўшы яе, вы зможаце вызначыць тэму нашай размовы.




1) На палянцы пасля цёплай ночкі
Глядзяць блакітныя вочкі. (Пралескі)
2) Я ў стракатым сарафане,
Залюбуецца – хто гляне.
Пра мяне складаюць песні…
Я і ў парку, я і ў лесе. (Бяроза)
3) Медзяныя ногі,
Свінцовыя рогі,
На ўвесь твар акуляр,
У вадзе гаспадар. (Вадалаз)
4) Што за беленькая мушка
Апусцілася на вушка,
Ледзь чутно паказытала,
І яе не стала.(Сняжынка)
5) Белым пухам замяло
І палеткі, і сяло.

Мост праз рэчку хутка ляжа,
А што гэта, хто адкажа? (Зіма)

6) Ён нарадзіўся на страсе,
Вялікі вырас пакрысе.
На сонцы грэцца ледзь пачаў,
Заплакаў моўчкі і прапаў (Лядзяш)
7) Што за гаспадар лясны
Спіць пад снегам да вясны? (Мядзведзь)
8) Чырвоны сабака ў печы гуляе,
Ніколі не брэша, а рукі кусае (Агонь)
9) Конь не просіць сена вехаць,
На ім можна верхам ехаць.
Мільгацяць два колы-ногі
І імчаць ускрай дарогі. (Веласіпед)
10) Я заўжды гасцей страчаю,
Вопратку я іх трымаю. (Вешалка)

Так, сапраўды. Сёння мы з вамі накіруемся ў падарожжа па Краіне беларускай мовы. А таксама даведаемся, хто з вас лепш ведае жыхароў гэтай чароўнай краіны. Так, так, я не памылілася. Гэтая краіна чароўная, і я вам гэта зараз дакажу. Справа ў тым, што ў гэтых словах схавалася шмат іншых. А якіх? Вы зараз іх адшукаеце самі. (Вывешваецца таблічка “родная мова”, дзеці з літар складаюць новыя словы).

Малайцы! А як вы ведаеце, кожная чароўная краіна мае чароўных жыхароў. У гасцях у іх мы з вамі сёння пабываем.

Перш, чым накіравацца ў падарожжа, давайце адгадаем, на чым мы паедзем, а для гэтага неабходна з літар скласці слова. (Дзеці размяшчаюць літары папарадку і атрымліваюць слова “аўтобус”)

***-размінка “Едзем на аўтобусе”***

Мы з вамі пад’язджаем да першага прыпынку пад назвай **“Рэбусны”.** Як вы думаеце, чым парадуе нас гэты прыпынак? Вядома, цікавымі рэбусамі і незвычайнымі заданнямі.

| Г 1 А |
|---|

(гадзіна)

| РЫРЫ |
|---|

(двары)

А А
А А
АА
А А

А Ч
Р (Нарач)

А А (каза)

Малайцы! Добра разгадалі рэбусы. А каб даведацца, як называецца наш наступны прыпынак, разгадайце яшчэ адзін.
1 8 2 19 10 1

| А Б В Г Д Е Ж З І К Л М Н О П Р С Т У Ф Х Ц Ч Ш Э Ю Я |
|---|

Так, гэта незвычайная рака, якая называецца Азбукай. А вось і рэчышча нашай ракі. Каб пераплысці яе, складаем мосцік са слоў на літары алфавіта. *(Дзеці прыдумваюць словы на дадзеныя літары).*
Гульня "Станьце папарадку" (дзецям прапаноўваецца стаць так, каб іх імёны ішлі ў алфавітным парадку).

Адпраўляемся далей, а пакуль наш аўтобус будзе ехаць, давайце пагуляем. Гульня называецца "Літара згубілася".

Весела звініць збанок (званок),
Кліча: "Дзеці, на ўрок!"
"Малако дае карова",-
Напісаў на кошцы (на дошцы) Вова.
Ліза мазі папрасіла,
Лізу вуха (муха) укусіла.
Закрычаў Рыгорка:
"З неба ўпала горка (зорка)!"
Не праедзем, дружа,
На дарозе ружа (лужа).
Кажа Славік Светцы:
-Цесна тыгру ў кветцы (клетцы).
Памажыце, ды хутчэй,
Я не сплю ўжо пяць начэй.
Так ударыўся аб слуп,
Што зламаў пярэдні дуб (зуб).
Радуецца Воля:
Узышла фасоля,
І на градцы ля ракі
Павылазілі суркі (гуркі).

Пакуль мы з вамі выпраўлялі памылкі ў вершы, наш аўтобус прыехаў на наступны прыпынак, які называецца **"Прыпынак гульні".**

Давайце сыграем у гульню "Галовы і хвасты". (Дзеці бяруць часткі слоў – галовы і хвасты – і ставяць іх спераду або ззаду прапанаванай часткі, каб атрымалася правільнае слова).

Гульня “Цыферблат” (На гадзінніку замест лічбаў стаяць літары, а лічбы ўнізе. Трэба па лічбах і літарах скласці імёны і прозвішчы вядомых беларускіх пісьменнікаў і паэтаў)

Адпраўляемся далей, а каб весялей было ехаць, давайце адкажам на пытанні віктарыны:

1. Якая літара нашай мовы гука не абазначае? (ь)
2. Колькі ў беларускай мове галосных гукаў? Пералічыце. (6 – а, о, у, ы, і, э)
3. Як называюцца гукі, якія ў нашай мове заўсёды цвёрдыя? (зацвярдзелыя)
4. Якая кніга першай знаёміць нас з літарамі? (буквар)
5. Які зычны гук заўсёды мяккі? (й)

Вось мы з вамі і прыехалі да апошняга прыпынку нашага падарожжа, які называецца **“Прыпынак казкі”.**

1-е заданне – адгадаць назвы казак, якія крыху сцёрліся.
2-е заданне – адгадайце, да якіх казак намаляваны малюнкі.
3-е заданне – праінсцэніраваць падрыхтаваныя раней урыўкі казак.

Вось і закончылася наша падарожжа. Ці спадабалася вам яно? А што трэба рабіць, каб такія падарожжы былі заўсёды цікавымі?

Мы развітваемся, а я жадаю вам поспехаў у вывучэнні сакрэтаў роднай мовы.